Садаўнічы Э.В.,
канд. філал. навук,
дацэнт

## ПРАБЛЕМА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ

Адной з галоўных мэт таго, што мы называем «нацыянальным адраджэннем», ад якое залежыць духоўнае і культурнае адраджэнне беларускага народа як нацыі, з'яўляецца абуджэнне, выхаванне, развіццё ў кожным беларусу нацыянальнай самасвядомасці. Супярэчнікі беларускага нацыянальнага адраджэння, што змагаюцца супраць мовы і наогул усялякай «беларускасці» ў беларускай дзяржаве, чамусьці бачаць ў гэтым адраджэнні нейкае варожае супрацьпастаўленне беларускага народа іншым народам, у першую чаргу -- рускаму. Яны не зважаюць на тое, што ў самой Расіі ў апошнія гады распачалася магутная патрыятычная кампанія за духоўнае аднаўленне рускага народа. Там гэта нармальна, на Беларусі ж -- нацыяналізм. Гэтыя «ахоўнікі» рускае культуры, адмаўляючы беларускую, тым самым выяўляюць сваё агульнае бескультур'е, невуцтва і пемрашальства, няглед зячы на ўсе свае ступені і званні, бо сапраўды культурны і інтэлігентны чалавек з павагай ставіцца да культуры любога народа, якая б яна ні была, і не дазволіць сабе яе абражаць.

Да гонару большасці дзеячаў беларускай культуры, мастацтва, навукі такія якасці ім не ўласцівыя. Беларускае літаратуразнаўства, выпрацоўваючы новы падыход да вывучэння гісторыі беларускай літаратуры, якраз і бачыць яе разгляд не ў адасобленасці ад культуры іншых народаў, а ў «далучанасці», па словах акадэміка М.Лазарука, да сусветнага літаратурнага працэсу. Прафесар А.Рагуля, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры Белдзяржуніверсітэта, лічыць, што беларускую культуру, у тым ліку і мастацкую, трэба вывучаць у кантэксце, на фоне сусветнай.

Такі падыход уяўляецца вельмі плённым для даследавання гісторыі беларускай літаратуры, для разумення асаблівасцей нашага нацыянальнага культурнага, духоўнага развіцця праз выявы агульначалавечых мастацкіх заканамернасцей і тэндэнцый на беларускай глебе. Многія з'явы беларускага мастацтва ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу паўстаюць у новым, больш аб'ектыўным і рэальным асвятленні.

Возьмем, напрыклад, сярэднявечны перыяд. У ім вылучаюцца галоўныя напрамкі ў развіцці літаратуры, якія вызначаюць яе асноўныя этапы ў гэтым працэсе. Царкоўная літаратура сваімі вытокамі звязана яшчэ з антычным светам, але на мэце мела не столькі адлюстраванне рэчаіснасці, колькі прапаганду і сцвярджэнне рэлігійна-маральных поглядаў. Царкоўная доўгі час была адзіным культурным асяродкам. Свецкая літаратура павінна была пачынаць з самага пачатку. Першапачатковы этап яе развіцця -- вусная народная творчасць. З развіццём феадалізму ўзнікла рыцарская, а за ёй -- і гарадская літаратура. Адзіным для ўсходніх славян выдатным помнікам гераічнага народнага эпасу з'яўляецца «Слова аб палку Ігаравым», які можна параўнаць са знакамітай «Песняй пра Раланда» і іншымі падобнымі творамі заходнееўрапейскай літаратуры. Калі не ўлічваць казак, песень, паданняў і перакладных рыцарскіх раманаў, то відавочна, што асноўнымі ў беларускай літаратуры на працягу многіх стагоддзяў заставаліся царкоўная літаратура і летапісы.

З антычных часоў вядома, што мастацкая проза ўзрасла на гісторыі, філасофіі, красамоўстве. Нашы летапісы -- гэта гістарычныя творы. Творчасць, скажам, Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага -- і царкоўная літаратура, і філасофія, і часткова -- красамоўства. Нават такія выдатныя прадстаўнікі Адраджэння на Беларусі, як Францыск Скарына ці Васіль Цяпінскі, працавалі ў рэчышчы царкоўнай літаратуры, якая па сутнасці была варожай гуманістычным ідэалам Адраджэння. На Беларусі зусім не развівалася рыцарская і гарадская літаратура, мастацкія варункі якой склалі трывалы падмурак магутнай літаратуры еўрапейскага Адраджэння. Царкоўная літаратура, як і лацінская свецкая паэзія Гусоўскага і іншых беларускіх паэтаў, не магла стаць і не стала грунтам уласна мастацкай нацыянальнай літаратуры, бо яна хутчэй была гісторыяй рэлігійна-філасофскай думкі. І сталася так, што ў Вялікім княстве Літоўскім пры самай перадавой у Еўропе па тым часе палітычнай культуры, пры глыбокай і багатай філасофскай думцы існавала даволі слабая мастацкая культура. Чаму? А.Рагуля ставіць пытанне: а ці няма сувязі паміж узроўнем мастацкай літаратуры і глыбінёй нацыянальнай самасвядомасці грамадства? На гэтае і многія іншыя пытанні, якія ўзнікаюць пры разглядзе гісторыі беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу, і павінна даць адказ літаратуразнаўства, каб унесці свой плён у духоўнае нацыянальнае адраджэнне беларускага народа.

Ільіна Н.Р.,
ст. выкладчык

## ДУХОЎНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПАЭТЫЧНАГА ВОБРАЗА

Культура і літаратура беларускага народа -- гэта наша слава і гордасць. У іх цудоўна адлюстраваліся нацыянальныя рысы беларускага народа, яго лепшыя падзеі і мары, яго высакародныя імкненні і мудрасць жыцця. Беларуская мастацкая літаратура на працягу ўсяго шляху свайго развіцця была непарыўна звязана з рускай літаратурай. Перш за ўсё іх аб'ядноўвае духоўны патэнцыял паэтычнага вобраза. Асаблі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта адчуваецца ў XX стагоддзі, калі ў Беларусі ўзнік шырокі літаратурны рух. І менавіта неўміручыя творы вялікіх рускіх майстроў мастацкага слова дапамаглі беларускім пісьменнікам разабрацца ў складаных умовах рэчаіснасці, знаёмілі з багаццем і разнастайнасцю прыёмаў паэтычнай творчасці.

Гэтыя духоўныя адносіны вялікіх літаратур можна прасачыць на прыкладзе творчых адносін таленавітага паэта, класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча і рускага паэта, крытыка, грамадскага дзеяча Валерыя Брусава.

Максім Багдановіч быў адным з тых, хто з энтузіязмам працягваў ніці духоўнай сувязі паміж рускім і беларускім народамі. Багдановіч – чалавек велізарных здольнасцей, высокай адукаванасці, неабмежаваных творчых магчымасцей, «жывая энцыклапедыя разнастайных ведаў», як яго называлі. Дзейнасць Багда-новіча складаная, шматгранная і вельмі значная. Ён быў не толькі таленавітым паэтам, але і бліскучым майстрам публіцыстычнага слова, крытыкам і тэарэтыкам літаратуры. «Яго артыкулы ў гэтай галіне,-- пісаў Я.Колас, -- здзіўляюць смеласцю думкі, глыбокім пранікненнем у сутнасць паэтычных твораў». Багдановіч з'яўляўся выразнікам поглядаў прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў беларускай літаратуры, прадстаўніком той часткі інтэлігенцыі, якая лічыла, што славянскія народы павінны звязваць вузы духоўныя. І Максім Багдановіч, як ніхто іншы, адчуваў гэту сувязь. У сваіх артыкулах ён неаднаразова падкрэсліваў агульнасць усходнееўрапейскіх народаў.

У артыкуле «Забыты шлях», напісаным у 1915 годзе, М.Багдановіч заклікаў беларускіх пісьменнікаў «уліць у нашу паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народа, лепей наталіць яе духоўную смагу і сапраўды ўзяцца за вялікую працу: развіццё беларускай народнай культуры».

У каго ж вучыўся сам Багдановіч, дзе чэрпаў тую духоўнасць, якой прасякнуты ўсе яго творы? Вядома, у свайго народа. А яшчэ ў лепшых прадстаўнікоў братніх культур. Так, напрыклад, высока цаніў М.Багдановіч рускага паэта Валерыя Брусава. Ён вызначаў прапагандысцкі, асветніцкі характар дзейнасці Брусава, яго нястомную працу як перакладчыка і эксперыментатара, высока цаніў яго паэтычнае майстэрст-ва. Менавіта Брусаў быў блізкім для Багдановіча паэтам, у якога ён вучыўся, за творчым майстэрствам якога заўжды ўважліва сачыў. Сувязь Багдановіча з Брусавым была не толькі па лініі тэм, стылістычных асаблівасцей і літаратурных інтарэсаў, але і па важнейшых тэарэтычных пытаннях. А самае галоўнае тое, што і Брусаў, і Багдановіч надавалі вялікае значэнне патэнцыялу паэтычнага вобраза, яго ўплыву на чытача.

Станоўча ацэньваючы рэалістычныя творы В.Брусава, М.Багдановіч працягвае традыцыі паэзіі рускага майстра ў сваіх творах. Менавіта гэтыя традыцыі паэзіі яднаюць вялікіх паэтаў.

Саладоўнікаў С.В.,
канд. філал. навук,
дацэнт

## НАВУКА, ЛІТАРАТУРА І НАВУКОВАЯ ФАНТАСТЫКА

Пісьменнікі, якія працуюць у жанрах навуковай фантастыкі, ствараюць творы ў адзінай паэтыцы: апісваюць будучыню, добрую ці дрэнную (утопія і антыўтопія), касмічныя цывілізацыі, ствараюць новы погляд на чалавека і чалавецтва. Навуковая фантастыка многа ўзяла ад рамантызму. А ў сярэдзіне XX стагоддзя ў навуковай фантастыцы ўзнік новы жанр -- «фэнтэзі», у ім сплавіліся казка і навука, міф і паданне, «гатычны раман» і гісторыя.

Мастакі, пісьменнікі, паэты з самых старых часоў цягнуліся да стварэння «структурно возможных» светаў. У гэтым напрамку ішло супрацьстаянне рэалістычнай літаратуры і той, што аддавала перавагу паэзіі, палёту ўяўлення, фантазіі. Дарэчы кажучы, неабходна адзначыць, што змадэляваныя светы іншы раз вельмі блізкія да рэальных. Напрыклад, карціны пекла ў паэме Дантэ «Боская камедыя». Але свет, у якім мы існуем, ці, як лічаць некаторыя філосафы, у які мы «закінуты», мы называем «светам нармальным», або «светам рэальным».Вобразы яго адпавядаюць рэчаіснасці. Праўда, другія філосафы (напрыклад, Д.Берклі), сцвярджаюць, што свет і ўсё ў ім наогул рэальна толькі ў чалавечых адчуваннях і існуюць пастолькі, паколькі гэты свет намі ўспрымаецца.

У рэалістычным расказванні малюнкі рэальнага свету па сутнасці спрачаюцца з фотакарткай і самой рэчаіснасцю. Канешне, сутнасць большасці літаратурных сюжэтаў так ці гэтак ідзе ад рэальнасці, ад жыцця і яго праблем, яго канфліктаў, сітуацый. Дзейнічае і катэгорыя выпадковасці: «Што здарылася б, калі б у Францыі XIX стагоддзя на самой справе існаваў Расціньяк або нехта, па прозвішчу Монтэ-Крыста, аказваў уплыў на курсы парыжскай біржы з дапамогай аптычнага тэлеграфа?» Тэма прататыпаў -- асобная тэма.

Істотнае адрозненне навуковай фантастыкі ад рэалістычнай прозы заключаецца у тым, што яе свет, вобразы, сітуацыі (хаця і не ўсе) сапраўды «структурна» адрозніваюцца ад свету рэальнага. Паэтыка навуковай фантастыкі карыстаецца сваёй логікай. Скажам, аўтар можа задацца пытаннем: «Што б зрабілася, калі б у нейкім свеце, які мы лічам нармальным, пайшлі б з'явы іншай логікі, іншых законаў прыроды?»

У рэалістычных творах апісваюцца і абыгрываюцца тыя механізмы, якія створаны людзьмі ў працэсе будаўніцтва жыцця на планеце Зямля. Але ў думках, ма-рах людзі могуць парушаць парадак ці нават і самыя законы прыроды. Гэта мы бачым у казках,